ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
І.Г.Лашкевіч
«20» сакавіка 2023 г.

**ЗАДАННІ** сакавіка 2023 г.
**для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд**
**па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**

Дата правядзення: 29 сакавіка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

**VI клас**

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа. Нацыянальная мова – мова, якая з’яўляецца сродкам пісьмовых і вусных зносін нацыі. Адзначце сярод прапанаваных тэрмінаў, размеркаваўшы іх у схеме, той, які мае больш шырокае лексічнае значэнне: *“дыялектная мова”, “нацыянальная мова”, “літаратурная мова”*.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | + | | = | |

2. Разгорнутае выказванне адной асобы называецца ____________________.
3. Як адным словам называецца ячневая каша з мёдам, арэхамі або шкваркамі? Падказка: калядная рытуальная страва, без яе святочная вячэра губляла свой сакральны сэнс. __________________.
4. Прыгадайце, які горад быў пабудаваны для Рагнеды і Ізяслава? _________.
5. Укажыце, колькі разоў гук [а] сустракаецца ў сказе: *Аднойчы, калі моцна разгулялася мяцеліца, нехта пастукаў у акно.*_____________

**Заданне 2. Прачытайце сказы. У якіх сказах род падкрэсленых назоўнікаў не адпавядае нормам сучаснай беларускай літаратурнай мовы? Запішыце словазлучэнне з такім назоўнікам у правільнай форме.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(1 бал – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| | |
|---|---|
| Трывога за дзяцей заўсёды адгукаецца ў сэрцы пякучай боллю. | |
| Мясцовыя ўлады арганізавалі для жыхароў раёна аўтамабільнае ралі. | |
| – Які прыгожы жырафа! Якая доўгая шыя ў жырафы! | |

| | |
|---|---|
| У парку брахала невялікая сабака. | |
| Дождж змяніўся на град, белая гусь закрывала сваімі крыламі дзетак, спрабуючы выратаваць ад сюрпрызаў прыроды. | |

**Заданне 3. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры перад адкрытым урокам сказала вучням:** "Дзеці, запомніце: сёння вам прыйдзецца добра папрацаваць. Калі не ўсё будзе атрымлівацца – не перажывайце, а супакойцеся і зноў прымайцеся за справу. Тады напрыканцы занятку вы атрымаеце асалоду". **У сказах замяніце падкрэсленыя словы ці выразы фразеалагізмамі, каб сэнс выказвання не змяніўся.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

запомніце – ____________________________________________

добра папрацаваць – ____________________________________

не перажывайце – _______________________________________

супакойцеся – __________________________________________

атрымаеце асалоду – ____________________________________

**Заданне 4. Размяркуйце словы па слупках у залежнасці ад спосабу ўтварэння.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала за кожнае правільна размеркаванае слова).*

Ціха, невысокі, нідзе, узгорак, бяздомны, знішчальнік, бялець, парашутыст, зрэдку, узбярэжны.

| суфіксальны | прыставачна-суфіксальны | прыставачны |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |
| | | |

**Заданне 5. Вучні напісалі сачыненне на самастойна абраную тэму. Прачытайце назвы сачыненняў і па загалоўках вызначце тып тэксту:**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

1. *Што такое шчасце?*________________
2. *Як мы хадзілі ў паход.* _________________
3. *Мой сябар Нікіта.* _______________
4. *Любімы хатні гадаванец.*__________________
5. *Ці патрэбна кніга ў XXI стагоддзі?*________________
6. *Як я правёў канікулы ў бабулі.*____________________
7. *Зімовы пейзаж.* _____________________
8. *Нечаканы госць.* ____________________
9. *Чужому навучайся ды свайго не цурайся.* ________________
10. *Вясна ў лесе.* ________________

**Заданне 6. Запішыце словазлучэнні па-беларуску, падбіраючы кожны раз новы дзеяслоў.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| Открыть окно | |
| Открыть заседание | |
| Открыть воду | |
| Открыть зонт | |
| Открыть театр | |
| Открыть возможность | |
| Открыть глаза | |
| Открыть заговор | |
| Открыть рот | |
| Открыть мысли | |

**Заданне 7. Разгледзьце ўважліва малюнак. Якому ўстойліваму выразу ён адпавядае? Складзіце невялікі тэкст, у якасці назвы запішыце ўзгаданы фразеалагізм.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



**Заданне 8. Узгадайце творы, з якімі вы пазнаёміліся на ўроках беларускай літаратуры. Вызначце трэцяе лішняе ў кожным радку. Падказка: герой з іншага твора.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № п/п | Героі | Трэцяе лішняе |
|---|---|---|
| 1. | Базыль, Міколка, Грышка | |
| 2. | Юсуфі, Стасік, Міця Бокуць | |
| 3. | Вадзянік, Лоўчы Сямён, Вужыны Кароль | |
| 4. | Пятро, Гнат, Ганначка | |
| 5. | Сяргей (мастак-анімаліст), мядзведзь Бурык, Сабака Брэх | |

**Заданне 9. Устанавіце адпаведнасць паміж назвай твора і тэмай, узнятай у ім. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4, Д5).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Назва твора | Тэма твора |
|---|---|
| А. Залаты птах | 1. Паказ заняткаў братоў у час вакацый і іх адносін да вучобы |
| Б. Датрымаў характар | 2. Пра пошукі маладым пакаленнем сваіх шляхоў |
| В. Лебядзіны скіт | 3. Вайна, убачаная дзіцячымі вачыма |
| Г. Салодкія яблыкі | 4. Падарожжы братоў у пошуках невядомага злодзея |
| Д. Крыніца | 5. Пра любоў людзей да сваёй Радзімы, свайго народа |

Адказ: А__, Б__, В__, Г__, Д__.

**Заданне 10. Запоўніце табліцу, размеркаваўшы звесткі з жыцця і творчасці адносна прозвішча пісьменніка (грамадскага дзеяча):** *1) узначальвае Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі; 2) надрукаваў першую кнігу на беларускай мове; 3) штогод пешшу падарожнічаў па Беларусі і збіраў фальклор; 4) месца нараджэння – вёска Акінчыцы Мінскай вобласці (у сям'і лесніка); 5) аўтар апавядання "Васількі".*

*Максімальная колькасць балаў – 5*

| Аўтар | Звесткі з жыцця і творчасці |
|---|---|
| Францыск Скарына | |
| Алесь Казека | |
| Міхась Лынькоў | |
| Ян Баршчэўскі | |
| Якуб Колас | |